к изучению информатики по новой программе на углубленном уровне после изучения базового курса информатики.

## НЕКАТОРЫЯ НАПРАМКІ ПЕРАХОДУ НА СІСТЭМУ ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДАШКОЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ

***Паздзеева Т.В., БДПУ імя М. Танка., Мінск***

Развіццё сістэмы дашкольнага выхавання ў нашай краіне абумоўлена патрэбамі і задачамі навукова–тэхнічнага прагрэсу, клопатам аб будучым нацыі, яе інтэлектуальным патэнцыяле.

Існуючая сучасная сістэма педагагічнай адукацыі — сярэдняя школа, педагагічнае вучылішча, педуніверсітэт і педвну, аспірантура, дактарантура, сістэма павышэння кваліфіккацыі — доўгі час забяспечвала патрэбнасці нашай краіны ў кваліфікаваных спецыялістах за кошт апрацаванага зместу фундаментальнай і прафесіянальнай падрыхтоўкі і высокіх патрабаванняў да студэнтаў. Аднак паскарэнне навукова–тэхнічнага прагрэсу, станаўленне рыначных адносін, неабходнасць адаптацыі кадраў у хутка зменлівых умовах патрабуюць пераходу да новай сістэмы адукацыі.

Сусветны вопыт развіцця вышэйшай прафесіянальнай адукацыі паказвае, што большасць цывілізаваных краін здзяйсняюць падрыхтоўку спецыялістаў на ўзроўні бакалаўрыята і магістратуры.

Аналіз шматузроўневай сістэмы паказвае, што яна дазваляе больш эфектыўна:

- забяспечыць варыятыўнасць навучання — выбар розных адукацыйных і прафесіянальных праграм — і тым самым садзейнічаць больш пэўнай рэалізацыі творчых патэнцый асобы;
- палепшыць умовы для адбору актыўных і здольных студэнтаў і адсеву раўнадушных да вучобы;
- здзейсніць гуманізацыю вышэйшай педагагічнай школы, звязаную з паваротам усіх звенняў вучэбнага працэсу да асобы студэнта і выкладчыка;
- правесці далейшую фундаменталізацыю прафесіянальна–адукацыйных праграм;
- здзейсніць гібкасць навучання, хуткае рэагаванне на змяненне сацыяльных прагрэсаў, стварэнне рэзерву высокаадукаваных выпускнікоў базавага ўзроўню;
- адаптаваць спецыяліста да рыначных адносін, якія будуць залежаць ад узроўню занятасці і ўзроўню прапановы ў той ці іншай сферы працы;



- забяспечыць эквівалентнасць дыпломаў, гэта значыць прыблізіць сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў да міжнародных стандартаў.

Указаныя перавагі даюць падставу лічыць, што ў сучасных умовах шматузрўневая сістэма можа даць новы імпульс падрыхтоўцы педагагічных кадраў для дашкольных устаноў Беларусі. Аднак пераход да шматузроўневай сістэмы неабходна здзяйсняць паступова, па меры стварэння пэўных вучэбна–метадычных, арганізацыйных, кадравых і матэрыяльных перадумоў.

Неабходнасць пераходу да новай сістэмы падрыхтоўкі выхавальнікаў, арганізатараў дашкольнага выхавання розных узроўняў, інструктараў–метадыстаў па фізічнаму выхаванню, выкладчыкаў замежнай мовы, практычных псіхолагаў дыктуецца патрэбнасцямі стварэння нацыянальнай сістэмы адукацыі. Першыя крокі ў гэтым накірунку зроблены. Аднак поўная рэалізацыя магчыма толькі з укараненнем шматузроўневай сістэмы падрыхтоўкі кадраў для дашкольных устаноў.

Творчым калектывам распрацаваны вучэбны план факультэта дашкольнага выхавання, магчымы варыянт сістэмы шматузроўневай падрыхтоўкі педагагічных работнікаў дашкольных устаноў з улікам патрабаванняў кваліфікацыйнай характарыстыкі, прафесіяграмы дзённага і вячэрняга аддзялення.

Факультэт распрацаваў кваліфікацыйную характарыстыку, якая ўключае інварыянтную і варыятыўную частку. У нас ёсць добрыя напрацоўкі. Інварыянтная частка складаецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі дзяржаўных стандартаў вышэйшай адукацыі. Варыятыўная частка змяшчае ўсё, што тычыцца спецыфікі факультэта, тых патрабаванняў, якія будзе прад'яўляць факультэт да асобасных і прафесіянальных якасцяў спецыяліста пэўнага профілю.

Кваліфікацыйная характарыстыка з'яўляецца асновай распрацоўкі крытэрыяў, колькасна–якасных паказчыкаў спосабаў ацэнкі ўзроўню падрыхтоўкі выхавацеляў, бакалаўраў, вучэбных планаў і праграм.

Прафесіяграма больш дакладна вызначае змест сацыяльнага заказу грамадства да асобы педагога і яго прафесійнай дзейнасці.

Новая сістэма навучання патрабуе ад факультэта работы над інтэнсіфікацыяй вучэбнага працэсу, вызначэння аб'ёму і зместу трансліруемай інфармацыі, укаранення новых тэхналогій і рэйтынгавай сістэмы ацэнкі якасці падрыхтоўкі студэнтаў і ўзроўню кваліфікацыі выкладчыкаў.



Рэпазіторый БДПУ